

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец – рэдакцыя газеты СВАБОДА
Наклад 90.000
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Аўторак, 9 верасня 1997 г. № 99 Кошт свабодны

Ізяслаў сустрэнецца з Філарэтам

Сёння ў Кіеў па запрашэнні Яго Святлейшаства Патрыярха усяе Украіны-Русі Філарэта прыбывае Першаіерарх Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы Мітрапаліт Ізяслаў. Як падкрэсліў Барыс Данілюк, сакратар Кансысторы БАПЦ, якая знаходзіцца ў Брукліне (ЗША), *«супольнасць гістарычных шляхоў і згоднасць імкненняў у змаганні супраць увасобленага ў Маскоўскім патрыярхаце расійскага імперыялізму наказваюць патрэбу бліжэйшай лучнасці і цяснейшага супрацоўніцтва паміж БАПЦ і Кіеўскім Патрыярхатам Украінскай Праваслаўнай Царквы»*.

Уладыка Ізяслаў сустрэнецца з Патрыярхам усяе Украіны-Русі Філарэтам і іншымі іерархамі УПЦ. Будзе абмеркаваны стан беларуска-ўкраінскіх міжцаркоўных адносін.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Рабаўнікі на матацыклах

На рахунку трох рокераў аказался цэлы шэраг начных грабяжоў і крадзяжоў з магазінаў і кватэр у некалькіх раёнах Магілёўшчыны. У арсенале затрыманых аказаліся шэсць матацыклаў, а таксама некалькі абрэзаў, самапальны пісталет, гранаты. Злачынцы базіраваліся ў лесе, адкуль выязджалі на свае злачынныя справы глухімі прасёлачнымі дарогамі. Узрост кожнага з затрыманых — крыху больш за 20 гадоў.

БелаПАН

Ад Аршанскай бітвы да бітваў сённяшніх

Па характару прамоваў, якія гучалі падчас святкавання Дня беларускай вайсковай славы, можна прадбачыць, якой будзе палітычная восень-97.

У Беларусі ўжо прызвычаіліся, што барацьба за дэмакратычныя каштоўнасці і захаванне незалежнасці краіны мае ўсё ж такі сезонны характар, больш актыўна праходзіць у вясну і восень. Пад гэтыя хвалі чалавечых настрояў вымушаныя падстройвацца і палітыкі. Для абвяшчэння пачатку чарговага палітычнага сезона — восені-97 — лідэры беларускай апазіцыі абралі святкаванне Аршанскай перамогі, якая калісьці, у 1514 годзе, спыніла захопніцкую навалу, што набліжалася на Беларусь з усходу.



Восень-97 пачалася вельмі эмацыянальна.

І гэта лагічна. У такі дзень больш да месца геаграфічныя і зместавыя паралелі, што дае магчымасць палітыкам узмацніць пафас сваіх прамоваў і падняць настрой аўдыторыі. *«Дыктатары і палітрукі прыходзяць і сыходзяць, а беларускі народ і яго слава застаецца. Народ адчуе і ўжо адчуў сваю годнасць, і мы ўбачым гэта ў хуткім часе»*, — упэўнена заявіў выконваючы абавязкі старшыні БНФ Лявон Баршчэўскі наконт перспектыў восені-97. Але ягоны калега Вінцук Вячорка упэўнены: гэты сезон палітычнай барацьбы будзе вольны ад надзей на Усход: *«Мы ўсе бачылі, як Барыс Ельцын здаў Лукашэнку беларускіх журналістаў, якія працавалі на расійскім тэлебачанні, і канчаткова зразумелі: Масква будзе і надалей гандляваць беларускай незалежнасцю і дэмакратыяй»*. І вось яшчэ чаму восень-97 будзе ў палітычным сэнсе гарачай.

«Не дапусцім холаду і голаду!» — пад такім лозунгам, згодна з аб'явай, павінна прайсці 12 кастрычніка акцыя пратэсту, якую Фронт рыхтуе сумесна з незалежнымі прафсаюзамі і жаночымі арганізацыямі.

Між тым, іншыя апазіцыйныя сілы не спяшаюцца вызначыць свае адносіны да Масквы, чым дэманструюць, што пакуль яшчэ аддзяляюць Расію афіцыйную ад Расіі дэмакратычнай. Ва ўсякім разе, на аршанскім свяце не было бачна ані кіраўнікоў аб'яднаных дэмакратаў, ані грамадоўцаў абодвух накірункаў. Магчыма, ім не вельмі дaспадобы лозунг *«Я люблю NATO»* (на англійскай мове), на фоне якога падчас аршанскага святкавання змагаліся чорна-белы і чырвоны рыцары (пабітым аказаўся чырвоны)? Альбо існуюць менш значныя, тактычныя прычыны таго, што нашыя «ліберальы» і «эсдэкі» зноў прапускаюць на пярэдні фронт барацьбы «нацыяналаў». Ва ўсякім разе бачна, што восень пачынаецца без дасягнення адзінства апазіцыйных сілаў.

Трэба, аднак, адзначыць, што суб'ект палітыкі, вакол якога можа быць дасягнутае гэткае адзінства, ёсць і не збіраецца адседжвацца. Старшыня ВС Сямён Шарэцкі, чыё выступленне на мітынгу вызначалася рашучасцю і бескампраміснасцю, прадэманстраваў як меншае жаданне працягваць жорсткую палітычную барацьбу. *«Замест таго, каб умацоўваць беларускую дзяржаву, выканаўчая ўлада на чале з Лукашэнкам хоча далучыць яе да Расіі і завезці на нашу тэрыторыю ядзерную зброю, што стварае для народа новую пагрозу быць знішчаным як у выніку акцыі міліцыі, так і ў пажары вайны»*, — з такой ацэнкай уладаў выступіў Сямён Шарэцкі і ў канцы прамовы заявіў, што гатовы бараніць незалежнасць Беларусі. Што ж тычыцца балючага пытання падтрымкі расійскім кіраўніцтвам рэжыму ў Беларусі, Шарэцкі ўпэўнены: *«Калі Расія хоча быць сапраўды дэмакратычнай краінай, ёй самой патрэбна незалежная і дэмакратычная, а не лукашэнкаўска-таталітарная Беларусь»*. Адзначым, што гэтыя словы — водгук тых прынцыпаў, на якіх сёння будуецца агульны еўрапейскі дом, і паўтарэнне гэтых тэзісаў старшынёй ВС Беларусі яшчэ раз сведчыць: свае палітычныя спадзяванні Сямён Шарэцкі ўсё шчыльней звязвае не з Усходам, а з Захадам.

Паглядзім, аднак, як гэта адаб'ецца на падзеях палітычнай восені-97. Пакуль заходні ўплыў на нашую сітуацыю не вырашальны, хаця і магчыма, што пасля апошніх расійска-беларускіх канфліктаў ён будзе адчувацца мацней. У любым выпадку трэба адзначыць: ніколі яшчэ за апошнія гады сітуацыя тут, у Беларусі, не залежала настолькі ад мясцовых сілаў, як цяпер, увосень 1997 года.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Якое ж свята вайсковай славы без турніру латнікаў?



«Дзядзькава» жніво

5—6 верасня ў Вільні адбылася канферэнцыя лідэраў 11 краінаў з удзелам А.Лукашэнкі

У славутай паэме «Новая зямля» Якуб Колас апісаў свайго дзядзьку Антося, беларускага селяніна, які трапляе ў сталіцу краю — Вільню. У вялікім шматмоўным горадзе яму няўтульна, ён тут нягеглы недарэка. Але, дзякуючы збегу абставінаў, ён з годнасцю выходзіць са складаных сітуацыяў...

Раздзел «Дзядзька ў Вільні» з паэмы Коласа прыгадаўся мне падчас нядаўняга візіту ў Вільню А.Лукашэнкі. Насуперак усім прагнозам, прэзідэнт беларускага электарату не зніякавеў перад палітычным бамондам Цэнтральнай Еўропы. Наадварот, ён прыдбаў сабе большую папулярнасць і паехаў з Вільні яшчэ больш упэўнены ў сабе.

І не спынілася машына,
А ўжо пайшла мітусяніна...

За ўсю сваю гісторыю старажытная Вільня ніколі не бачыла стольні кіраўнікоў дзяржаваў адначасова. Зладзіўшы канферэнцыю «Суіснаванне народаў і добрасуседскія адносіны — гарант бяспекі і стабільнасці ў Еўропе», Літва прадэманстравала здольнасць праводзіць маштабныя мерапрыемствы. Аднак пасля шумнага палітычнага шоў тут задаюцца пытаннем: навошта яно было?

Напярэдадні канферэнцыі атмасфера ў літоўскіх СМІ дасягала істэрыкі. Недакладнасці, узаемавыключная інфармацыя, чуткі і інтэрпрэтацыі запоўнілі друк і эфір. Гармідар з арганізацыяй сустрэчы быў запраграмаваны. Галоўная прычына — запрашэнне ў Вільню Лукашэнкі. Газета *Respublika* зазначыла: *«...з вялікім сумам даводзіцца канстатаваць два моманты. Па-першае, ні тыя, хто фармуе знешнюю палітыку Літвы, ні канкрэтныя арганізатары канферэнцыі так і не вырашылі, як ставіцца да гэтага палітычнага дзеяча. Другая непрыемная памылка літоўскіх палітыкаў — поўная адсутнасць палітычнай дальнабачнасці. А.Лукашэнка кожны дзень падносіць усё новыя «черные делишки». Сёння ўсе сур'ёзныя газеты безумоўна называюць яго таталітарным тыранам. Такую сітуацыю варта было прадбачыць і быць да яе гатовымі»*.

Палітыкаў у Літве хваляюць і іншыя праблемы. Канферэнцыя прэзідэнтаў выявіла рознагалоссі паміж прэзідэнтурай Бразаўскаса і большасцю ў Сейме. Падставаю для ўзаемных папрокаў сталі прычынены месяц назад дзверы ў *NATO* і Еўрасаюз, калі Еўракамісія прызнала Літву не гатовай да ўступлення ў ЕС. Усю віну за гэта правыя ўскладаюць персанальна на Бразаўскага. Гэта сапраўды параза Бразаўскаса, бо ён гаварыў пра ЕС як пра вырашаную справу. У снежні ў Люксембургу ў Літвы застаецца апошні шанец перакапаць кіраўнікоў Еўрасаюза. У гэтым святле міжнароднае шоў было дарэчы: і свету паказаць, і заручыцца падтрымкаю некаторых краінаў.

Акрамя гэтага, на канферэнцыю лёг няшэршы цень прэзідэнцкіх выбараў, якія адбудуцца сёлета 21 снежня. Палітыкі, якія імкнуцца ў кіраўнікі краіны, вялі кампанію па дыскрэдытацыі канферэнцыі прэзідэнтаў. Яшчэ месяц таму старшыня Сейма сп. Ландсбергіс высмейваў мерапрыемства і ягоныя запланаваныя вынікі. Некаторыя аналітыкі папярэджвалі, што ніхто не здолее даць рады Лукашэнку. Бо ён, як высветлілася, не збіраецца мінімальнічаць нават з Крамлём, а натацыі з боку Літвы і яе суседзяў можа проста абсмяяць.

З боку Сейма была і спроба правакацыі — дэпутацкая дэлегацыя вылецела на святкаванне 6-й гадавіны незалежнасці Чачні. Латвія і Эстонія на такую дзёрзкасць не адважыліся. Кіраўніцтва Сейма імкнулася паставіць пад сумнеў прыезд на канферэнцыю кіраўнікоў Расіі. Дыпламаты адкратаваліся, Чарнамырдзін у Вільню прыехаў, паказаў прыхільнасць да Бразаўскаса. Аднак падчас канферэнцыі расійскія МЗС і Дума выказалі раздражненне і занепакоенасць «нядружалюбнасцю» іншых літоўскіх палітыкаў.

Другой казырнай картай стаў Лукашэнка. Прэса раздзьмула скандал вакол пазіцыі прэзідэнтаў Чэхіі, Славакіі і Фінляндыі ў сувязі з запрашэннем гэтага дзелегата з Мінска. Вэрхал нібыта пацвярджаў прагноз Ландсбергіса, што з-за Лукашэнкі ў Вільню ніхто не прыедзе. Аднак большасць удзельнікаў прыехала, і амаль усе ўрэшце захацелі сустрэцца з кіраўніком Беларусі. Лідэры Чэхіі, Славакіі і Фінляндыі нідзе напрамую не заявілі, што не хочуць бачыць Лукашэнку, аднак прадэманстравалі свае адносіны да мінскага рэжыму і пры гэтым не пакрыўдзілі Беларусь як дзяржаву. Манеры літоўскіх палітыкаў і журналістаў на гэтым тле выглядалі карава.

Віленскі брыфінг Фонда Сораса з нагоды закрыцця беларускага аддзялення гэтай арганізацыі таксама быў прымеркаваны да прэзідэнцкае канферэнцыі. Аднак пакольгэта была нелітоўская гульня, прэса пра брыфінг амаль не пісала. Затое валтузня вакол пікета віленскіх беларусаў была раскручана напоўніцу. Бо ў яе апынуліся ўцягнутыя і прэзідэнт Літвы, і мэр Вільні, і міністар унутраных справаў, і Сейм. Што ўжо казаць пра выкрытую змову сямі афіцэраў дабраахвотнай службы аховы краю! На раніцу 5 верасня ўсе газеты (толькі па-літоўску!) выйшлі з шапкамі на першых палосах: «Добраахвотнікі рыхталі тэрарыстычны акт супраць Лукашэнкі». Інцыдэнту былі прысвечаныя цэлыя газетныя старонкі! Нішто сабе фон для паведамленняў аб працы канферэнцыі лідэраў 11 краінаў...

У прасторнай, чыстай,
светлай зале
Паны туды-сюды
снавалі...

На канферэнцыі, апроч 10 прэзідэнтаў еўрапейскіх краінаў і прэм'ера Расіі, прысутнічаў міністр замежных справаў Даніі Нільс Хельвег Петэрсан, прэзідэнт Парламенцкай Асамблеі Еўрасаюза Лені Фішэр, удзельнік Еўракамісіі Аніта Гардын, экс-міністр замежных справаў Нямеччыны Г.-Д.Геншар, славуты палітолаг з ЗША Глоўбл, лаўрэат прэміі Нобеля паэт Чэслаў Мілаш, усе кандыдаты ў прэзідэнты Літвы, шмат палітыкаў, грамадскіх і рэлігійных дзеячоў, навукоўцаў амаль з усіх кантынентаў. Прывітальную тэлеграму канферэнцыі даслаў Біл Клінтан. Сумеснае прывітанне склалі прэзідэнты Нямеччыны і Францыі — Герцаг і Шырак. Віталі сустрэчу Вацлаў Гавэл і Прэзідэнт Еўракамісіі Жак Сантэр...

Сустрэча паінна была скончыцца кампрамісньімі высновамі, змянаю стэрэатыпаў, нефармальнымі прапановамі па інтэграцыі Цэнтральнай Еўропы. Да гэтага заклікалі арганізатары канферэнцыі, прэзідэнты Польшчы і Літвы... Квасьнеўскі прапанаваў варыянты рэальнага супрацоўніцтва: палітычнага і культурнага — па ўзор Вышаградскай групы, куды ў свой час клікалі і Беларусь, і эканамічнага — на ўзор *CEFTA*, саюза вольнага гандлю і сумеснага гаспадарання (Польшча, Славакія, Венгрыя, Чэхія, Славенія і Румынія). Дэбаты натыкнуліся на дзьве праблемы — пашырэнне *NATO* і... Лукашэнка.

Бразаўскас адкрыў канферэнцыю словамі пра тое, што ўдзел краінаў Цэнтральнай Еўропы ў *NATO* і Еўрасаюза забяспечыць ім *«стабільную, бяспечную і заможную будучыню»*. А Чарнамырдзін напрыканцы сурова падкрэсліў, што выбар краінаў Балтыі — сур'ёзная памылка... Аднак Расія прагне *«актывізаваць экспарт літоўскіх харчоў»*.

Пра сітуацыю ў Беларусі гаварылася прасталінейна. *«Мы імкнёмся шчыра і цярпліва весці дыялог з Беларуссю. Мы супраць міжнароднай ізаляцыі гэтай краіны. Польшча ўпэўненая, што Еўропе патрэбная дэмакратычная і незалежная Беларусь*, — казаў Квасьнеўскі. — *Але мы памятаем, што зарукай мірнага і сяброўскага суіснавання ёсць павага да асноўных дэмакратычных стандартаў...»* У тым жа духу выказаўся і Бразаўскас: *«У апошні час часта згадваецца Беларусь... Ігнараванне агульнапрынятых прынцыпаў заўсёды абарочваецца супраць дзяржавы і яе грамадзянаў. Але ізаляцыя любой дзяржавы не садзейнічае замацаванню ў ёй агульных нормаў дэмакратыі»*. Чарнамырдзін не ўстрымаўся, каб не заўважыць: *«Расія займае ўзважаную і тактоўную пазіцыю ў дачыненні да Лукашэнкі. Мы не можам не бачыць, што ў Беларусі маюць месца пэўныя выдаткі пераходнага перыяду да дэмакратыі»*.

Ідзе так дзядзька і па бруку,
Адзін за дзесяць робіць
гурку...

Ну а што наш «дзядзька»? Адразу ў сваім выступе Лукашэнка заявіў, што Беларусь трапіла ў разрад няўгодных за сваю

(Працяг на стар. 2)

Хто ж і куды запрашаў Каржакова?

Прэзідэнцкая прэс-служба не дала яснага адказу наконт таго, ці запрашаў Лукашэнка наведаць Мінск Аляксандра Каржакова.

Нагадаем, што спачатку ў маскоўскай прэсе, а потым і ў нашай газеце была апублікаваная інфармацыя, што прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запрасіў у Мінск былога шэфа службы бяспекі расійскага прэзідэнта генерала Аляксандра Каржакова. Быццам бы А.Лукашэнка мае намер прапанаваць Каржакову *«працу па спецыяльнасці»*.

У гутарцы з карэспандэнтам БелаПАН кіраўнік прэс-службы беларускага прэзідэнта Валерый Талкачоў не абвергі не пацвердзіў гэтую інфармацыю, заявіўшы, што аб падобных дзеяннях А.Лукашэнкі яму нічога невядома. В.Талкачоў выказаўся таксама ў тым духу, што, калі запрашэнне А.Каржакову наведаць Мінск і існуе, то ў гэтым няма нічога дзіўнага, паколькі генерал Аляксандр Каржакоў з'яўляецца цяпер дэпутатам Дзяржаўнай думы Расійскай Федэрацыі.

А.С.

Дзмітрый Завадскі:
Мне няма ў чым каяцца

У пятніцу выйшаў на свабоду аператар здымачнай групы Паўла Шарамета Дзмітрый Завадскі, які быў арыштаваны 26 ліпеня па абвінавачванні ў незаконным пераходзе беларуска-літоўскай мяжы.

Прэс-служба КДБ, БТ і іншыя дзяржаўныя СМІ сцвярджаюць, што мера стрымання Завадскаму была змененая пасля пісьмовага зварота да Лукашэнкі, у якім журналіст ОРТ нібыта прызнае сваю віну. Карэспандэнт СВАБОДЫ сустрэўся з Дзмітрыем пасля яго вызвалення, і Завадскі раскрыў акалічнасці гэтай справы. Па яговых словах, падчас усяго знаходжання ў турме ён не атрымліваў ніякай інфармацыі. У камеры не было ні тэлевізара, ні радыёкропкі, а з газет давалі чытаць толькі «Гродзенскую праўду», таму ён нічога не ведаў аб тым, якая барацьба разгарнулася за іхняе вызваленне. Трэцяга верасня да яго ў турму быў дапушчаны карэспандэнт «Інтэрфакса» Сяргей Заяц, які пачаў угаворваць Завадскага напісаць зварот да прэзідэнта. Дзмітрый у катэгарычнай форме адмовіўся пісаць ліст. Размова была перанесеная на наступны дзень, і С.Заяц настаяў на сваім і сам склаў тэкст звароту. Дзмітрый гаворыць, што ён пастаянна адчуваў на сабе псіхалагічны ціск следчых, якія хлусліва запэўнівалі яго, што прэса піша толькі пра Шарамета, а пра цябе, маўляў, усе забыліся.

Але нават у тым тэксце звароту, які быў змешчаны ў суботнім нумары «СБ» і які, па словах Д.Завадскага, адрозніваецца ад рукапіснага арыгінала, няма ніякіх пакаянняў.

Завадскі сказаў, што не шкадуе аб тым, што зняў той скандальны рэпартаж і нават гэтым вымушаным зваротам ён не пашкодзіў Паўлу Шарамету. Толькі пасля выхаду з турмы Дзмітрый зразумеў, у якую палітычную гульню яго ўцягнулі. Пасля вызвалення Д.Завадскага ў суправаджэнні двух кагэбістаў адвезлі ў гасцініцу і пасялілі пад чужым (!) імем. Яму было забаронена пакідаць нумар і падыходзіць ад тэлефона. Там ён упершыню ўбачыў тэлесюжэты БТ і тую хлусню, якую выліваюць на яго і Паўла Шарамета былыя калегі Дзмітрыя з беларускага тэлебачання.

На наступны дзень Завадскага адвезлі на вочную стаўку з Шараметам, пасля чаго Дзмітрыя адпусцілі на свабоду і ён змог вярнуцца ў Мінск. Дзмітрый ганарыцца тым, што працаваў разам з Паўлам Шараметам і ні ў чым не збіраецца каяцца.

Тым часам загадчык беларускага бюро ОРТ па-ранейшаму знаходзіцца ў камеры гродзенскай турмы. Зніклі спадзяванні на тое, што Павел выйдзе на свабоду пасля сустрэчы Лукашэнкі з Ельцыным 6 верасня ў Маскве. Падобна, што састарэлы расійскі прэзідэнт прайграў маладому і нахабнаму беларускаму дыктатару. Так, Ельцын заявіў, што сапраўды пытанні вакол расійскіх журналістаў у Беларусі знятыя. Лукашэнка ў інтэрв'ю радыёстанцыі «Маяк» пацвердзіў, што сапраўды пытанняў няма. Справа *«былых карэспандэнтаў ОРТ»* перадаецца ў выключную кампетэнцыю следчых органаў Рэспублікі Беларусь — паведаміў маскоўскім журналістам Рыгоравіч. Але як пасля такой ганебнай паразы будзе выглядаць імідж Расіі і яе прэзідэнта на міжнароднай арэне? Хто будзе паважаць краіну, якая не можа вызваліць сваіх журналістаў, узятых у заложнікі кіраўніцтвам краіны-сатэліта?

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

У Маладога фронту – адразу тры старшыні

Устаноўчы Сойм маладзёжнай арганізацыі «Малады фронт» прайшоў у суботу ў мінскім Палацы культуры тонкасуконнага аб'яднання. У ім прыняло ўдзел 218 дэлегатаў з усіх рэгіёнаў краіны.

Пры ўсёй сваёй значнасці для кансалідацыі сілаў маладых апазіцыянераў Сойм пакінуў дваістае ўражанне. Са з'ездаўскай трыбуны прагучала нямала прыгожых патрыятычных прамоваў, няраз дэлегаты перапынялі даклады выступоўцаў дружнымі воклічамі «Жыве Беларусь!» Але як у прамовах лідэраў апазіцыі Сямёна Шарэцкага, Лявона Баршчэўскага і факсавым пасланні да моладзі Зянона Пазьняка, так і ў выступах маладых фронтаўцаў, на жаль, было мала канкрэтыкі. У асноўным гучалі агульныя словы аб неабходнасці барацьбы з рэжымам, але канструктыўных прапановаў аб канкрэтных дзеяннях было мала.

Безумоўна, радуе шчырае жаданне маладой генерацыі, якая ўжо актыўна праявіла сябе падчас двух гарачых палітычных вёснаў 1996 і 1997 гадоў, працаваць на аднаўленне дэмакратыі і законнасці ў нашай краіне. Хацелася б толькі, каб моладзь не паўтарала памылак старэйшага пакалення адраджэнцаў, шукала новыя, нездзевальваваныя падыходы ў сваёй працы. Пры ўсёй павазе да слоў лідэраў «Маладога фронту», якія гавораць, што іхняе аб'яднанне мае характар арганізацыі новага тыпу, з'езд паказаў, што нават унутры моладафронтаўцаў існуюць паважныя рознагалоссі. Шмат часу патрацілі дэлегаты, каб прыйсці да згоды адносна формы кіраўніцтва арганізацыяй. Аргкамітэтам было прапанавана ўвесці інстытут трох сустаршыняў, якія прадстаўлялі б мінскую, гродзенскую і магілёўскую рэгіянальныя арганізацыі як найбольш шматлікія. Гэтая прапанова сустрэла рашучы супраціў значнай часткі дэлегатаў, якія выступалі за ўвядзенне пасады старшыні і некалькіх яго намеснікаў, бо такім чынам, на іх думку, можна захаваць прапарцыянальнае прадстаўніцтва ўсіх рэгіёнаў у кіраванні арганізацыяй. Разгарэліся гарачыя спрэчкі, і толькі галасаванне паставіла кропку ў супрацьстаянні. У выніку з невялікай перавагай у 16 галасоў перамаглі прыхільнікі сустаршынства. У кіраўніцтва «Маладога фронту» абраны Павел Севярынец (Мінск), Алесь Асіпцоў (Магілёў) і Сяргей Паўленка (Гродна): за іх кандыдатуры прагаласавала 112 дэлегатаў, а таксама рада, у якую ўвайшлі больш за 40 чалавек.

Была прынятая праграмная заява, а таксама ўхвалы з патрабаваннем вызваліць з турмаў Паўла Шарамета і двух маладафронтаўцаў са Стаўбцоў — Аляксея Шыдлоўскага і Вадзіма Лабковіча, супраць якіх узбуджаная крымінальная справа па факце напісання ў горадзе шэрагу лозунгаў.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

«Дзядзькава» жніво

(Пачатак на стар. 1)

інтэграцыю з Расіяй. Пасля наваліўся на прэсу. Маўляў, тыя, хто прыязджае ў Беларусь, шакаваны розніцай паміж тым, што пра нас пішуць, і тым, як усё цудоўна насамрэч. І... запрасіў усіх удзельнікаў канферэнцыі правесці наступную сустрэчу ў Мінску. Пытанне пра сітуацыю ў Беларусі такім чынам было знятае. Некаторыя назіральнікі пасля такой «шчырасці» аж разгубіліся. Пакуль не з'ездзіш у Мінск да Лукашэнкі, атрымліваецца, няма чаго гаварыць. Ну, а пасля таго, як Лукашэнка перад тэлекамерамі спрытней за ўсіх пасадзіў і паліў дубочак, ды яшчэ астатнім дапамог, хто б яго стаў ушчуваць? Здаровы, абаяльны, фотагенічны...

Прыблізна ў тым жа духу мінскі госць «здымаў» пытанні і на перамовах. Як толькі Лукашэнка са шчырай усмешкай увайшоў у Бразаўскасаў палац, ён заявіў, што дамову аб вяртанні нелегалаў (рэадмісіі) падпіша неадкладна. Аднак сустрэча кіраўнікоў дзьвюх краінаў скончылася безвынікова. *«Лукашэнка сказаў мне, што дзеля падпісання гэтае дамовы не было дамоўленасці з Расіяй»*, — з прыкрасцю адзначыў Бразаўскас. Пра надзённасць праблемы можна меркаваць з таго, што толькі падчас канферэнцыі ў Вільні і Віленскім раёне затрыманыя 10 кітайцаў, 3 пакістанцы і 2 індусы. Усе яны трапілі сюды з Беларусі. А ўсяго пад Вільняй ужо сабрана звыш 900 нелегалаў з Азіі і Афрыкі, якіх трэба карміць, апранаць, лячыць і даваць дах. Грошай, каб жыць альбо вярнуцца дахаты, у іх няма. Большасць з іх пасля падпісання дамовы адправіцца ў Беларусь. Натуральна, Бразаўскас раздражнёны, але... што рабіць, калі Лукашэнка будзе надалей цягнуць з дамовай? Лукашэнка паабяцаў падпісаць трохбаковы (з Расіяй) дакумент. І тут выйграў! Прыцягнуў на пусты месцы ўвагу да свае асобы ўсёй Еўропы, Расіі, паставіў у бязвыхадное становішча Літву.. Зрэшты, увагі Лукашэнку хапала і без таго. У апошні момант стала вядома, што ён прыбывае не машынаю, а самалётам. Толькі на мяжы паспелі ўсё «вылізаць», сцягнуць ахову, а тут... Але прыехаў-такі лімузінам. Гэта растлумачылі верагоднасцю тэракту ў аэрапорце. Сустракалі яго не толькі прэзідэнтура Літвы, але і пікет беларусаў на Катэдральным пляцы. Пікет, пра які тыдзень пісала віленская прэса, быў дазволены ў апошні момант. На ім сабралася ўтрая больш журналістаў, чым было саміх пікетоўшчыкаў. Разам са спецслужбоўцамі пікет, на які сабралася з тузін саміх беларусаў, ператварыўся ў самую яркую падзею дня. Пасля размоваў з пікетоўшчыкамі інтарэс журналістаў да Лукашэнкі распаліўся. Неўзабаве і ён сам пракаціў міма пікета...



На віленскім саміце Лукашэнка, здаецца, блішчэў больш за ўсіх.

На раніцу — паведамленне пра планаваны замах. Як і шмат з таго, што тутака пісалася і гаварылася, паведамленні былі няўцямнымі. У Шаўлях і Радвілішках папралі сем чалавек (усе — літоўцы) з Добраахвотнай службы аховы краю (*SKAT*). Меркаваны арганізатар тэракта — Вітаўтас Драсуціс, былы савецкі афіцэр, цяпер службовец *SKAT*. У прэсе падаецца, што выкрыццё замаху — справа спецслужбаў Літвы, Беларусі і Расіі. Маўляў, перад тым быў званок у прэзідэнтуру Эстоніі(?!) і ананім па-руску без акцэнту... папярэдзіў пра планаваны замах на аднаго з удзельнікаў канферэнцыі. Ландсбергіс сцвярджае, што і ён быў «у курсе». Згадваюцца літоўскія нацыянал-сацыялісты(?!), якія, між тым, усё адмаўляюць. З абурэннем паведамляецца, што арыштаваныя ўсё імкнуцца спіхнуць на вядомых у Літве асобаў. Што з гэтага вынікае? Невядома, навошта літоўцам спатрэбілася «забіваць Лукашэнку»... Высновы можна зрабіць дзьве: нехта «падставіў» *SKAT*, які даўно муляе вока ўладам сваёй бескантрольнасцю, і нехта свядома падняў рэйтынг Лукашэнкі. На ўсю гэтую шуміху апошні задаволена заўважыў, што яго ўжо тры гады хочуць забіць. Рыхтык Фідэль Кастра! Здымкі Лукашэнкі з'явіліся ў газетах часцей за здымкі Бразаўскаса і Квасьнеўскага...

Гаворыць дзядзька сам з сабою,
Пыл абтрасаючы рукою...

Канферэнцыя абышлася Літве ў немалыя грошы. Толькі на добраўпарадкаванне Вільні было патрачана звыш 10 млн. літаў (2,5 млн. долараў). Тры дні ў Вільні дзяжурылі звыш 800 паліцэйскіх, сотні вайсоўцаў, пажарных, медыкаў, сапёраў і работнікаў спецслужбаў. Удзельнікам канферэнцыі ўручыны залатыя гадзіннікі *Time Star* у кавалках бурштыну па 300 грамаў. Над кожным такім сувенірам працавала 15 чалавек. І гэтак далей... Дзеля чаго?

Дзеля прэстыжу Літвы ў свеце. Прэстыж — дарагая рэч. Але плён ад яго будзе відавочным: *NATO*, ЕС, Еўропа. Для літоўскіх палітыкаў — гэта шанец размясціць перад прэзідэнцкай гонкаю і засвяціцца на знешнепалітычнай арэне. Для Вільні — гэта зрух наперад у дабрабыце і 11 маладых дубкоў у прэзідэнцкім парку, пасаджаных еўрапейскімі лідэрамі.

Для нас — гэта спачуванне суседзяў. Для Лукашэнкі — поспех, бо ён унікнуў сур'ёзнай крытыкі і стварыў вакол сябе ажыятаж, літаральна зацяніўшы астатніх удзельнікаў канферэнцыі.

Гары КУМАНЕЦКІ
спецыяльна для СВАБОДЫ

ПАМЯЦЬ

На ўгодкі блакады

Учора на плошчы Перамогі ў Мінску сабралося больш за 200 ветэранаў Другой сусветнай вайны — абаронцаў і тагачасных жыхароў Ленінграда.

Яны адзначылі ўгодкі блакады Ленінграда, якая пачалася 8 верасня 1941 года і доўжылася амаль што тры гады. Ветэраны ўсклалі кветкі да помніка Перамогі, а святар адслужыў імшу па загінуўшых. Мерапрыемства скончылася канцэртам і праглядам кінафільма ў Доме Ветэрана.

Як паведаміў нам прадстаўнік Савета ветэранаў, на сённяшні дзень у Мінску налічваецца каля 680 ветэранаў-«блакаднікаў», але з кожным годам іх становіцца ўсё менш.

Р.П.

Смерць беларуса ў Іспаніі

Памёр прафесар Аляксандр Люцко, рэктар размешчанага ў Мінску Міжнароднага інстытута па радыёэкалогіі імя А.Сахарава.

Смерць А.Люцко стала вынікам сардэчнага прыступу і напаткала яго ў Іспаніі, 4 верасня падчас пешай прагулкі ў горы ля горада Грэнада — на вышыні 2.600 метраў над узроўнем мора.

А.Люцко нарадзіўся ў 1941 годзе. Са студзеня 1992 г. — арганізатар і першы рэктар Міжнароднага інстытута па радыёэкалогіі імя А.Сахарава. Аўтар шэрагу вучэбных дапаможнікаў па радыяцыйнай бяспецы для ўсіх класаў сярэдняй школы, падручніка па дазіметрыі, некалькіх навукова-папулярных кніг і мноства артыкулаў.

БелаПАН

На мінулым тыдні ва ўзросце 53 гадоў заўчасна пайшоў з жыцця прафесар Міхась Раманюк — этнограф, мастацтвазнаўца, загадчык кафедры Беларускай акадэміі мастацтваў. Ён вывучаў і даследаваў прыкладное мастацтва беларусаў, сабраная ім калекцыя народнага касцюма экспанавалася ў Еўропе, у спадчыну застаўся вядомы альбом «Беларускае народнае адзенне» (1986), шэраг артыкулаў, тры кнігі ў рукапісе...

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) глыбока смуткуе з прычыны смерці Міхася Раманюка і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Цены снова тронулись

В прошлую среду, когда Александр Лукашенко после совещания в Совете министров заявил о том, что «обвала цен не будет», стало ясно, что начался сеанс массового гипноза, сопровождающегося ростом цен. И действительно, после рассказов президента о том, как он переживает за судьбу и, прежде всего, пропитание белорусского народа, оказалось, что в сентябре уже повышены и планируется еще повысить цены на хлеб и мясо.

Хлеб – дорогое удовольствие

Предприятиям хлебопекарной промышленности разрешено увеличить в сентябре розничные цены на хлеб на 10%, а на булочные изделия — на 5%. Однако рекомендовано повышать цены не сразу, а постепенно — по 2-3% в течение каждых 10 дней. Очевидно, это должно уменьшить негативное восприятие этого решения среди населения и дать возможность соблюсти установленные планом темпы инфляции — 2% в месяц.

Причиной роста цены на хлеб, в изложении министерства экономики, являются возросшие затраты на производство муки из зерна нового урожая.

Александр Лукашенко объяснил это по-своему, сообщив о множестве спекулянтов в приграничных с Россией областях, которые вывозят хлеб в Россию, где *«он в три-четыре раза дороже, и там продается»*. После этого он заметил, что этот рост цен надо компенсировать, и правительство согласилось с таким подходом. К сожалению, неизвестно, как и когда будет выплачиваться компенсация. Или же имелось в виду увеличение минимальной заработной платы?

Установлены также новые предельные отпускные цены (максимальная цена, по которой предприятие-производитель может продавать хлеб; учитывая, что торговые надбавки в магазине фиксированные, розничная цена обычно возрастает на аналогичный процент) на хлеб и хлебобулочные изделия. Так вот, предельные цены на хлеб, начиная с июня этого года, увеличены на намного больший процент. Например, предельная цена на хлеб массовых сортов увеличилась в сравнении с июньской ценой на 20%, на батоны массовых сортов — свыше 15%.

Таким образом, это несколько опровергает распространенное среди чиновников утверждение о том, что цены в Беларуси на социально значимые товары не растут или растут медленнее общего показателя инфляции.

Мясо – тоже роскошь

Достаточно причин набралось и для повышения цен на мясо. Всё то же министерство экономики обосновало увеличение предельных отпускных цен на говядину, полуфабрикаты из говядины, субпродукты, вареные колбасные изделия и мясо цыплят-бройлеров следующими причинами: повышением закупочных цен на крупный рогатый скот с 19 августа на 15%, убыточностью производства цыплят-бройлеров, информацией о напряженном положении с ресурсами мяса в республике.

Как и в случае с хлебом, удовольствие от повышения цен растягивается — рекомендовано повышать цены постепенно по 2-3% за декаду.

В результате, в сравнении с июньскими ценами, мясо подорожало достаточно серьезно. Стоимость говядины увеличилась на 17—30% (в зависимости от сорта). Существеннее всего увеличены цены на субпродукты (печень, сердце) — на 33—37%. Цена вареных колбас выросла примерно на 20%, говяжьих полуфабрикатов — на 23—27%. Дешевле всего обошлись цыплята-бройлеры — цена на них увеличена лишь на 5%.

Как бы то ни было, а дефицита говядины сейчас, похоже, не предвидится. Новые ценники в магазинах режут глаз. Государство поступило в очередной раз довольно хитро: оно якобы сначала увеличило минимальную заработную плату и лишь потом цены. Но новая зарплата реально будет выдана явно не раньше конца сентября, а цены-то выросли уже сейчас.

Изгнание бесов и заклинание духов

В упомянутом выше выступлении Лукашенко не обошелся без слов сочувствия и утешений по поводу роста цен: *«Если посмотреть цены, то тяжеловато людям жить. Тяжеловато даже тем, которые сегодня три миллиона получают. Это особенно в городе и в Минске. Двое деток — попробуй одень, накорми, а еще один ребенок — это муж, который тоже потребляет немало продуктов»*.

Было также дано поручение, *«чтобы... в наших средствах массовой информации были напечатаны цены по тарифам на зимний период — отопление, вода горячая, холодная, канализация, уборка мусора. Люди должны знать, что в сентябре, октябре, ноябре они будут стабильную платить цену... И таким образом, чтобы до 1 мая будущего года эти тарифы не изменялись... То же самое и по тарифам на перевозки, на билеты для перемещения в пассажирском транспорте... »* Интересно, не повысятся ли перед опубликованием тарифы настолько, что их действительно не нужно будет повышать в течение всей зимы?


Как бы то ни было, экономическая политика властей такова, что людям не только постоянно не дают возможности заработать деньги, давят налогами, из которых оплачиваются всякие президентские самолеты и прочие необходимые вещи, так еще государство и бездарно регулирует ценообразование. Вместо того, чтобы заняться финансовой стабилизацией и остановить рост реального курса доллара, власти обманывают самих себя, играя в административное регулирование: будем регулировать цены, будет маленькая инфляция, да еще и сами напишем курс доллара. Курс же доллара растет, зарплата обесценивается, реальные доходы населения падают... Зато чиновники при деле — цены «регулируют».

Алесь САДОВСКИЙ

ПОЧТА

Нас держат, как преступников

Но никаких преступлений мы не совершали



Уважаемая редакция! Мы, находящиеся в так называемом лечебно-трудовом профилактории №1 г.Светлогорска, просим вас опубликовать наше «Открытое письмо» президенту и Конституционному суду Республики Беларусь, а также парламенту. Все наши жалобы и просьбы, с которыми мы обращались в вышестоящие инстанции, не дали определенного ответа на вопрос: «Кто мы такие?»

Направляя нас на принудительное лечение, судьи руководствуются законом от 21.06.1991 г. (тогда было другое государство — СССР). И хотя лечения как такового в ЛТП не существует и в помине, вопрос остается открытым, т.к. мы находимся в колонии неизвестного режима, разработанного и навязанного МВД для лиц, совершивших уголовные преступления. Но мы ведь никаких преступлений не совершали и должны пользоваться всеми правами, определенными Конституцией РБ. Грубо нарушается ст. 41 данной Конституции. В отношении нас используется принудительный труд со всеми мерами воздействия в случае отказа от него. Очень много содержится людей, которые нуждаются в помощи квалифицированных врачей и лечении в специализированных больницах. Но все прикрыто наглой ложью, т.е. никакого лечения здесь нет, а есть раздутый штат медицинских работников, которые стабильно получают зарплату. На вопрос к администрации: «Для чего мы здесь находимся?» — получаем неопределенные ответы. Поневоле ощущаешь себя узаконенным рабом, т.к. труд низкооплачиваемый, а то и вообще не знаешь, за что работаешь. Также используется наш рабский труд в личных целях, начиная с администрации ЛТП и кончая местными органами власти. Создаются «аккордные бригады» по строительству жилья для сотрудников ЛТП с условием: сделаешь быстро, бесплатно — пойдешь домой раньше срока. На питание расценки устанавливает администрация, и ни о каком досрочном освобождении отсюда не может быть речи, если не погашена задолженность.

Направленные сюда люди нуждаются в спецодежде и прочем обмундировании. Но администрация отказывается предоставлять одежду, мотивируя это тем, что для этого надо иметь деньги на лицевом счете, чтобы оплатить за обмундирование. Но для того, чтобы иметь деньги, нужна хоть какая более или менее оплачиваемая работа. А таковой они предоставить всем не могут, т.к. ее можно получить за пределами ЛТП, но не для всех есть возможность даже выглянуть за забор из колючей проволоки.

Кто отбыл свой срок, попросту выбрасывается отсюда без каких-либо средств на существование. Многие возвращаются сюда, даже месяца не побыв на свободе, т.к. после такого «лечения» человеку нужна реабилитация в обществе. Как бы ни мотивировалось наше пребывание здесь, в сущности мы лишены свободы и человеческих прав. О наших правах вспоминают только перед выборами, т.к. мы имеем право голоса.

Из выступлений президента мы ясно усвоили, что в Республике Беларусь соблюдаются все права и свободы человека. Но как объяснить все происходящее с нами? Мы не будем приводить конкретные факты по каждому случаю противоправных действий, а хотим получить достаточно ясный и точный ответ на вопрос: «Кто мы такие?» И что это за «режимное учреждение МВД» (со слов администрации), в котором мы находимся от 1 года до 2 лет, не совершив преступления. Все наши возможности узнать что-либо уже исчерпаны.

Поэтому мы решили обратиться с письмом к президенту, Конституционному суду и парламенту Республики Беларусь через вашу газету.

С уважением, обитатели ЛТП-1 г.Светлогорска **Шмырин К.К., Юневич Ю.И., Капаев С.Н., Капустин В.А., Маркушев А.Н., Марьенко В.Г., Горовцов П.В., Вильчинский Н.К., Сухарев Н.Ф., Захаров И.Е., Шадурский В.В., Данилов Л.Л., Зеленков В.Н., Черкас Э.И, Ежов А.Н.** ***и другие (всего 158 фамилий с личными подписями).***

Раду БНР узначаліла жанчына

У Нью-Брансвіку (ЗША) адбылася 22-я сесія Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

Як вядома, гэтая арганізацыя дзейнічае ўжо дзесяткі гадоў за межамі Беларусі і лічыць сябе ўрадам на выгнанні. (Нагадаем, што ўкраінскі і польскі ўрады на выгнанні некалькі гадоў таму перадалі свае паўнамоцтвы ўрадам Краўчука і Валэнсы. Рада БНР на такі крок не пайшла.)

Рада БНР пацвердзіла свае паўнамоцтвы і вернасць ідэалам 25 Сакавіка (Дню абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918 годзе). Як адзначана ў адной з рэзалюцый сесіі, *«Рада лічыць утварэнне Рэспублікі Беларусь і замацаванне ейнай дзяржаўнай незалежнасці ў Канстытуцыі 1994 года этапам на шляху ажыццяўлення ідэалаў БНР»*. Разам з тым Рада заявіла пра непрызнанне ёю вынікаў рэферэндумаў, праведзеных у Беларусі ў траўні 1995 і лістападзе 1996 года, а таксама пра неабходнасць адстаўкі прэзідэнта Лукашэнкі. Адной са сваіх палітычных мэтаў Рада абвясціла максімальную міжнародную ізаляцыю рэжыму Лукашэнкі. У другой прынятай на сесіі рэзалюцыі — «Аб этнічнай дыскрымінацыі беларусаў і слуханнях у Кангрэсе ЗША аб парушэннях правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь» — заяўлена пра наяўнасць не толькі маральнага і палітычнага, але і фізічнага праследу грамадзянаў на тэрыторыі Беларусі паводле нацыянальнай прыкметы.

Сесія падзякавала Язэпу Сажычу за шматгадовую дзейнасць на пасадзе старшыні Рады БНР і абрала новае кіраўніцтва. Новым старшынёй стала Івонка Сурвіла — дачка дзеяча беларускага Адраджэння і міністра фінансаў ва ўрадзе БНР Уладзіміра Шыманца. Івонка Сурвіла нарадзілася ў Беларусі, але пакінула краіну разам з бацькамі, ратуючыся ад праследу бальшавікоў. Атрымала адукацыю ў Сарбоне. Каля 30 гадоў працавала ў структурах урада Канады. І.Сурвіла вядомая таксама сваёй дабрачыннай дапамогай ахвярам Чарнобыльскай катастрофы, яна ўзначальвае адзін з найбуйнейшых канадскіх фондаў, які ўжо перадаў у Беларусь лекі і медыкаменты на мільёны долараў ЗША. Намеснікамі старшыні Рады БНР абраныя Вітаўт Кіпель, Барыс Рагуля і Сяргей Навумчык.

БелаПАН

Главный ПАПАрацци

Владимир ПОДГОЛ

То, что происходит в нашей стране, выглядит со стороны таким абсурдом, что за его просмотр можно брать большие деньги. А если бы кто-то профинансировал телесъемки некоторых событий в Беларуси, то выгоднее бизнеса не найти. Ну, например, съемки судебного процесса над председателем Верховного Совета Республики Беларусь С.Шарецким за то, что он шел во главе колонны во время празднования государственного праздника — Дня Конституции! Или, например, визиты заместителей спикера в службу занятости, где вот уже полгода сотрудники, сбиваясь с ног, ищут им «равнозначную» работу. Бедные сотрудники, им хоть третий парламент создавай! Или легитимный восстанавливай!

А чего стоит, например, переписка граждан оппозиционеров с сегодняшними властителями! Вот первый заместитель председателя Верховного Совета Василий Новиков обращается в службу занятости и просит зачесть ему как формально безработному участие в трехсторонних переговорах по совершенствованию Конституции 1994 года как участие в общественных работах. Служба занятости посылает это заявление на экспертизу и получает ответ от первого заместителя председателя Комитета по труду Долматова, который пишет, что в связи с тем, что Верховного Совета не существует, а Новиков не является депутатом, то переговорно-консультационный труд Новикова с представителями президента при посредничестве политиков из Европы нельзя считать трудом. *«На основании вышеизложенного считаем, что представленные Новиковым В.Н. документы не освобождают его от выполнения месячной нормы общественных работ»*. Тут же по мозгам нормального человека бьет вопрос: «А с кем тогда вел переговоры Антонович?» И тут же добивает второй вопрос: «А президентским иванам зачтут за труд их переговоры, а может, вычтут из зарплаты эти дни, посчитав, что они не работали, а груши околачивали?!»

Или вот еще один пример. После разрушительного урагана, принесшего значительные разрушения и человеческие жертвы, после гибели четырех чернобыльских детей в автокатастрофе общественность обратилась к президенту с требованием отменить праздничные шоу и объявить траур. Президент не счел для себя за труд даже как-то отреагировать на нормальное человеческое обращение. Ну хоть бы как от мухи отмахнулся! Так нет же. С сияющим лицом все три дня лицезрел песни-пляски перед своим дворцом. И лишь кто-то из его министров, вроде как Иван А., заявил, что ну столько денег уже угрохали в подготовку праздников, что отменить их никак невозможно. Вот и смотрели бабки в глухих деревнях с разрушенными крышами по телевизору, как танцоры отбивали чечетку на президентской сцене, словно на крышках гробов погибших детей.



На снимке: Владимир Подгол в Аналитическом центре.

«Я свое государство за цивилизованным миром не поведу», — безапелляционно заявлял президент Беларуси. И скурпулезно доказывает свой принцип каждым словом и действием. Это вам не Англия, где по случаю гибели принцессы Дианы отменили не только все праздники, но и футбольные матчи. Даже банки — святая святых проклятого капитализма — и те закрылись на один день. Все скорбили об утрате.

Правда, не все. Папарацци — фотоохотники за «звездами» — не только не оказали первой помощи умирающей Диане, а наоборот, отталкивали полицейских, чтобы получить выгодный ракурс для фотографии и выгодно продать теперь уже фототруп народной любимицы.

Читатель, который далек от политики, справедливо возмущается и с облегчением вздохнет, успокоив себя: мол, у нас, слава Богу, и звезд нет и, соответственно, папарацци не может быть. И ошибется. Ведь тоталитарное государство, каким является сегодня Беларусь, даже работу папарацци сделало государственной.

Неугомонный депутат Щукин, например, убедился в этом на собственном опыте. Шел он по улице и увидел, что рядом с ним едет машина и один из пассажиров снимает его видеокамерой. Он дворами перебежками ушел на другую улицу. А там уже другая машина с телеоператором. Бородатый обалдел. Теперь каждый день Щукин бегал по улицам от странных белорусских папарацци, пока на одном из многочисленных судебных процессов свидетель-милиционер не обронил фразу, что, мол, снимал он Щукина по распоряжению начальства. Тут же последовал скромный депутатский запрос в прокуратуру: мол, на основании какого закона меня, Валерия Щукина, возвели в ранг кинозвезды и приставили государственных папарацци. Последовал молниеносный ответ: *«...На основании приказа министра внутренних дел РБ № 023 от 29.06.94 г. "О введение в действие Инструкции об организации и ведении профилактических, оперативно-розыскных и криминалистических учетов в органах внутренних дел" Вы действительно были поставлены на профилактический видео- и компьютерный учет в Центральном РОВД г.Минска. Нарушений действующего законодательства в действиях работников милиции, в ходе настоящей проверки, выявлено не было. Оснований для принятия мер прокурорского реагирования не имеется... Прокурор Центрального района г.Минска старший советник юстиции А.С.Рубис»*.

Смысл прокурорского документа примерно таков. Вы ужасный преступник, и мы следим за каждым вашим шагом. Обнял женщину на прогулке — могут кинуться к тебе и обвинить в том, что хочешь ее изнасиловать. Плюнул в сторону проезжей части проспекта Машерова — тут же за язык и в каталажку: хотел отравить президента своей ядовитой слюной!

Некоторые читатели скажут: «Ну вот фантазеры! Не может такого быть!» И сам Щукин так бы сказал, если бы не увидел однажды в деле, заведенном на него в милиции, фотоснимок, сделанный белорусским папарацци в погонах. На этом снимке депутат-коммунист идет на демонстрации и держит в руках огромную дубину! Этот снимок политической звезды фигурировал в одном из судебных процессов. Парадокс в том, что во время той демонстрации в правой руке Щукина была не дубина, а хрупкое плечо симпатичной журналистки-либералки.

Откуда же у наших фотогелебульбашей такое стремление к охоте за политическими звездами да еще с извращенным фотомонтажом? В тоталитарном государстве все винтики должны иметь резьбу как у главного Винта и такую же шляпку. Все болтики должны быть сделаны из того же «теста», что и главный Болт и иметь такие же, как у главного, и рот, и глаз, и чуб, и «болт». И точно так же его ложить на всех, как кладет главный.

Главный белорусский ПАПАрацци начал круто. Сели было депутаты на своем рабочем месте. Не просто сели. А сели и не ели — голодовка, значит. Главный, естественно, такое стерпеть не мог. Цитируем по стенограмме сессии Верховного Совета: *«...Когда мне Тесовец со слезами на глазах позвонил около 12 ночи и сказал: Александр Григорьевич, не получается по-хорошему! Повынимали ножи, достали ножницы и говорят, сперва вены себе отрезаем, потом головы, и вас отрезаем, кровью зальемся...* — ***Ну уж, извините,*** *— в резиденции президентской это уж слишком!..»*

ПАПАрацци приказал спасти депутатов и снимать сей гуманный акт аж на две телекамеры.

Спустя неделю он с вдохновением рассказывал эпизод спасения за обеденным столом своим подчиненным: "Я два года мечтал об этом! Мой телохранитель разбежался, подпрыгнул и двумя ногами засадил в грудь Пазьняку! Тот упал. Мой вскочил на Пазьняка и начал пальцами выдавливать ему глаза!"

Во время рассказа у ПАПАрацци потекли слюни и загорелись глаза, а некоторые слушатели не выдержали, встали из-за стола и вышли из комнаты...

Сняли они на пленку то спасение-выдворение-избиение, и главный ПАПАрацци на всю страну публично пообещал показать депутатов-звезд всем. Еще сообщил, что депутаты в зале законодательном пили да женщину под креслом прятали. У народа слюна потекла от ожидания такого секс-фильма! Два с половиной года публика изнывала от нетерпения. Но зажал ПАПА фильм: видимо, сам смотрит каждый день, как Пазьняку глаза выдавливают, как руки депутатам выкручивают и морды бьют (чтобы они их не поотрезали)... Да и завидно, небось, ему от того, что у депутатов женщины и дома, и в парламентском зале, а у него тут проблемы.

Теперь вам понятно, почему всех нас снимают? Одних скрытой камерой, других открытой, третьих просто в камере. А вот последняя фотоохота белорусских папарацци отличалась новыми чертами. Проводили журналисты митинг в поддержку свободы прессы и «врага всех пограничников» Павла Шеремета. В конце митинга все участники выстроились цепочкой вдоль улицы, образовав таким образом символический «километр свободы». Стал в эту цепочку и лидер БНФ Лявон Борщевский. «Километр свободы», как объявили организаторы митинга, был разрешен властями. Когда все выстроились, вдоль цепочки поехал милицейский телеброневик и телеоператор своей пушкой брал на прицел каждого участника: уникальная возможность для милицейских папарацци и других органов получить фотолица на всех активных митинговщиков-рецидивистов! На плече у Лявона Борщевского сидела дочь — двухлетняя Алеся. И вот напротив их телеброневик задержался и снимал отца и дочь дольше, чем других. Для чего? Неужели и двухлетняя Алеся получит свой порядковый номер в досье? Скажите — придумал? Но ведь уже судили сыновей писателя Владимира Орлова и директора лицея Владимира Коласа за то, что они «участвовали» и «несли». Ведь сегодня уже сидят за решеткой ребята, которые писали на стенах "Я люблю Беларусь!", "Беларусь — Наш Дом", "Жыве Беларусь!" Я с ужасом думаю, что вскоре маленькой Алесе предъявят обвинение в том, что она говорила не **«я люблю президента»**, а «люблю маму!»

В телерепортаже президентских папарацци из Вильнюса славянская «суперстар» с локоном страсти заявила: «Почитаешь эти независимые газеты и подумаешь, а в своем ли они уме?» Когда видишь, что вытворяют интеграсты с европейской страной, имеющей древние демократические традиции, вопросов типа "В своем ли они уме?" не возникает. Ответ очевиден: не в своем — в президентском.

А ответ на вопрос: "В своем ли уме президент?" известен даже детям, которые при виде батьки по телеку задорно смеются: "Ізноў пужаць будзе!" Взрослым уже не до смеха.

...Принцесса Диана страдала от папарацци. В роковые моменты своей жизни она спасалась бегством от моторизованных фотоохотников. Возможно, кого-то из них будут судить. В Беларуси, как известно, все не как в цивилизованном мире. На одном из митингов на площади Я.Коласа у президентского папарацци молодые ребята вырвали телекамеру, вытащили пленку и засветили ее. Щукин — человек исключительно интеллигентный и вежливый — тоже на грани терпения. Не исключено, что в один прекрасный момент он схватит не фальшивую дубину, которую ему вложили в руки путем фотомонтажа, а настоящую и врежет по лакированной крыше 600-го мерседеса главаря белорусских папарацци, а то и по лакированному «локону страсти» самого главаря! Врачи говорят, что этот метод хорошо излечивает.

Мать Тереза: вооруженная верой и состраданием

Мать Тереза, скончавшаяся в пятницу в возрасте 87 лет, была той почти легендарной женщиной, которая заслужила Нобелевскую премию за миссионерскую работу с бедняками Калькутты и покорила умы и сердца многих людей мира.



За свою заботу о бедных, покинутых и немощных ее окрестили в стране со множеством святых «живой святой». Ее человечность , самоотверженная преданность делу и бескорыстие завоевывали уважение премьер-министров и президентов. В основном Мать Тереза известна своей работой в Индии, в Калькутте. Ее организация «Миссионеры Милосердия», которую она организовала в 38 лет и которой руководила до самой смерти, поднялась из скромных ростков до международного Ордена, работающего в 150 странах мира.

Это принесло ей силу и славу, которой она избегала. На церемонии вручения Нобелевской премии в 1979 она попросила отменить праздничный банкет и направить деньги (около 5.000 долларов) на бесплатное питание для бедных. Нобелевский комитет согласился, а пожертвования европейской публики, тронутой беспрецедентной просьбой, составили более 50.000 долларов.

Мать Тереза, урожденная Агнес Гонкша Боджакшиу, родилась в 1910 году, по происхождению албанка. В семье было трое детей — она была младшей. Отец погиб при невыясненных обстоятельствах, когда ей было всего семь лет. Еще в юности Агнес вдохновилась работой югославских миссионеров в восточной провинции Индии, Бенгали, и поняла свое призвание. В 18 лет она отправилась в Ирландию, где постриглась в монахини и вступила в Орден Лорето, занимавшийся образованием бедных в Индии. В 1929 году она приехала в Калькутту, одинокая молодая женщина, которой так и не было суждено увидеть свою родину снова.

